# Школьны веснік

ДУА»Граўжышкоўскі ВПК яслі-сад-базавая школа»

Люты 2014

## Гісторыя школы

*У 1889г. у Ашмянскім павеце дзейнічалі 32 народныя вучылішчы, сярод іх і вучылішча ў Граўжышках. Настаўнікам працаваў Іван Папоў. Вучылішча размяшчалася ў панскім маёнтку каля возера. Вучаніцай гэтай навучальнай установы была заслужаны работнік культуры БССР, ураджэнка в.Граўжышкі, вядомая актрыса З.К.Скачкоўская.*

*У 1921-1934 гг. У Граўжышках працавала пачатковая школа, якая знаходзілася ў наёмных сялянскіх хатах, размешчаных у цэнтры вёскі.*

*У 1936 г. адкрыта школа-сямігодка імя Пільсудскага.*

*Будынак гэтай школы быў спецыяльна пабудаваны па індывідуальным праекце, распрацаваным для навучальных устаноў. Ён неаднаразова дапаўняўся,мяняўся да сучаснага выгляду, зараз тут Граўжышкоўская БШ. У 1937-1938 гг. Дырэктарам быў Юзаф Свёнтак, працавалі тры настаўнікі Мядзейка, Мядзейкава, Кандэрская). У 1939-1941 гг.- няпоўная сярэдняя школа, у гады вайны не працавала. 31.08.1944 г. аднаўлена сямігодка, але з-за недастатковай колькасці вучняў для камплектавання 5 класаў засталася пачатковай. Першы дырэктар Яблонская*

*3 лістапада 1948 г. зноў стала сямігадовай, з 1950-х гадоў- сярэдняя адукацыйная школа.*

*З верасня 2008 года школа стала базавай.*

*У розны час педагагічны калектыў узначальвалі В.Л.Волкава, І.І.Шылько,А.Іўчык, Н.Д.Нарэйка, М.Н.Гаўрош, А.Н.Дубянец, Г.А.Дзямідава, Я.Ч.Васілько, зараз П.В.Чаплінскі.*

***Н.Цярэшкіна***

***Ж.Шкелда***



**Пра след у жыцці**

**Спрачаемся да хрыпаты…**

**Трэба проста ісці,**

**Раз хочаш пакінуць ты**

**Не проста адбітак абутку**

**Нейкага там памеру,**

**Не добрыя чуткі,**

**а добрыя справы і веру.**

***Р.Тармолы-Мірскі***

# Выдатнік асветы



У Граўжышкоўскай школе працавала настаўніца Дзямідава Галіна Аляксееўна з 1965 года. У працоўнай кніжцы Галіны Аляксееўны Дзямідавай усяго адзін запіс: “1965 г. – настаўніца хіміі Граўжышкоўскай СШ”. Сюды яна прыйшла пасля заканчэння Віцебскага педагагічнага інстытута. У 1980г. – дырэктарам Граўжышкоўскай сярэдняй школы. На гэтай пасадзе Галіна Аляксееўна працавала 20 гадоў, вывела школу ў лік лепшых ў раёне.

Усе гады свайго дырэктарства Галіна Аляксееўна выкладала хімію. Нястомны творчы пошук аптымальных шляхоў арганізацыі работы з навучэнцамі дазволіў педагогу дамагчыся станоўчай дынамікі ў падрыхтоўцы знаўцаў хіміі абласнога і рэспубліканскага ўзроўняў. Настаўніца не толькі выкарыстоўвала на ўроках самыя прагрэсіўныя заняткі з вучнямі, але і праводзіла з вучнямі вопыты па вырошчванню памідраў ў адкрытым грунце. Матэрыялы даследчай дзейнасці былі прадстаўлены на ВДНХ СССР.

За плённую працу на ніве адукацыі Галіна Аляксееўна ўзнагароджана шматлікімі Ганаровымі граматамі раённага аддзела адукацыі, упраўлення адукацыі Гродзенскага аблвыканкама, Міністэрства адукацыі РБ. Ёй прысвоена званне “Выдатнік асветы СССР” (1984год). У 2013 годзе **Галіна** Аляксееўна адзначыла свой 70-гадовы юбілей.

**Д.Келдановіч**

*У працы не маеш права:*
*На роспач,*
*на слабасць,*
*На стому.*
*Твая пачэсная справа —*
*Жыццё адкрываць другому.*
*Алена Руцкая*

## Нарэйка Ніна Дзмітрыеўна



Нарадзілася ў 1926 годзе ў в.Мятла Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. Пасля заканчэння школы ў 1946 годзе паступіла ў Ашмянскае педагагічнае вучылішча, якое закончыла ў 1949 годзе і была накіравана на працу ў Палянскую сямігадовую школу настаўніцай пачатковых класаў. У гэтым жа годзе паступіла ў Маладзечанскі настаўніцкі інстытут на геаграфічны факультэт, які паспяхова закончыла ў 1953 годзе. З 1954 года па 1958 працавала дырэктарам Палянскай сямігодкі. З 1959 па 1988гг працавала ў Граўжышкоўскай СШ.

Узнагароджана значком «Выдатнік народнай асветы»,медалём «За доблесную працу», у 1982 годзе медалём «Ветэран працы», шматлікімі граматамі.

Памерла ў 2007 годзе.

**Ю.Чаплінская**

## *Трэба ў школе бываць часцей*

Трэба у школе бываць часцей… Гэтыя перафразіраваныя словы з верша вядомага беларускага паэта Рыгора Барадуліна прыгадваюцца напярэдадні Вечара сустрэчы з выпускнікамі школы. Так, трэба бываць у роднай школе хаця б раз у год, у лютым, каб сустрэцца са сваім дзяцінствам, убачыць былых аднакласнікаў, паразмаўляць з настаўнікамі, зазірнуць у класныя кабінеты, дзе былі першыя перамогі і няўдачы, а ў кагосьці і першае каханне, і першае расчараванне… І няважна, колькі гадоў прайшло з пары развітання…



З цягам часу мяняецца наша аблічча і светаўспрыманне. Дзяўчынкі са стужкамі ў валасах і хлопчыкі з партфелямі за плячыма застаюцца толькі на старых школьных фотаздымках. Але так, як і імя, нязменнае адно: для кагосьці мы па-ранейшаму засталіся аднакласнікамі. У першы суботні вечар лютага школа дорыць усім выпускнікам незвычайны падарунак – магчымасць вярнуцца ў свае школьныя гады. Задоўга да правядзення вечара прадумваецца сцэнарый святочнай праграмы, шукаюцца фотаздымкі “юбілейных” выпускнікоў, рыхтуюцца музычныя нумары. І наколькі ўдалым будзе вечар, залежыць таксама і ад выпускнікоў, ад тых, хто знойдзе час і, адклаўшы ў бок свае важныя і не вельмі справы, прыйдзе ў школу, якая так чакае ўсіх .У 2000-я з’явіліся мабільная сувязь і Інтэрнэт, і магчымасцей падтрымліваць стасункі стала больш. Вялікай папулярнасцю карыстаюцца сацыяльныя сеткі. Большасць з нас мае сваю старонку на “Одноклассниках”, мы перапісваемся , знаходзімся “В Контакте”. З іх дапамогай можна знайсці «раскіданых» па свеце школьных сяброў, размешчаныя на сайтах фотаздымкі дэманструюць, хто стаў паспяховым у працы, а хто– шчаслівым у сямейным жыцці. Гэта так. Але ўсё роўна ніякія сучасныя тэхналогіі не заменяць «жывых» зносін. Таму мы так любім вечары сустрэчы школьных сяброў. Іх правядзенне – добрая традыцыя, якая аб’ядноўвае многія пакаленні.

…Гэтага свята няма ў афіцыйным календары. І тым не менш, для многіх, хто вучыўся ў школе, першая субота лютага нават праз 40 гадоў застаецца вельмі важнай падзеяй. Школа для іх скончылася, а апошні званок яшчэ не празвінеў. Таму, дзесьці ў глыбіні душы яны па-ранейшаму проста хлопчыкі і дзяўчынкі. Аднакласнікі …

**Я.Васілько**

## Зімовая казка



*Зіма – чароўны час года. Вакол усе бела. Выйдзеш на вуліцу ўзімку і глядзіш на пейзаж, ад якога вока не адарваць. Дрэвы ў снезе, нібы яблыні ў белых колерах. І толькі дзе-нідзе віднеюцца гронкі рабіны. Пад рабінай шмат слядоў птушак. А на зямлі ўзвышаюцца гурбы. У чыстым паветры пахне ігліцай. З камінoў у неба кругамі ўецца дым.*

*На вокнах, здаецца, расцвілі нейкія казачныя, чароўныя кветкі. Усе шыбы ў прыгожых узорах, падобных на галінкі елак, аздобленых велізарнымі дыяментамі.*

*Заўсёды хочацца запомніць гэтую прыгажосць, каб потым зноў звяртацца да казачных успамінаў.*

*Але кожны год да нас прыходзіць новая зіма з новымі цудамі і пакідае новыя ўспаміны.*

***Паліна Буйаид***

## Зіма

*Зіма-прыгажуння пакрыла ўсю рознакаляровую зямлю бліскучым дыванам. Развесіла на галінах кустоў і дрэў свае кружавы. На шкле маналявала розныя арнаменты. Прыгажосць! Казка! Зіма - нібы нявеста ,якую снежань вядзе да шлюбу. Танцуюць свой вальс сняжынкі. Снег пакрывае пуховай коўдрай зямлю.*

*А як жа прыгожа зімоў у лесе! Спяць пад белымі снегавымі коўдрамі бярозкі. Накінуўшы сабе на галаву бліскучыя касынкі, чуваць, як дрыжаць на ветры асіны. З дрэў злятае снегавы пыл. Напэўна, кожнаму хочацца памераць снегавыя гурбы.*

*Мароз размалёўвае нас у чырвоны колер.*

*Адным словам, зімой усё ператвараецца ў казку!*

*Лера Грышкойць*



,

# Дыялог з дырэктарам

Вечар сустрэчы школьных сяброў… Што ён значыць у жыцці кожнага чалавека? Для адных — гэта сустрэча з аднакласнікамі, якіх не бачыў шмат год, для другіх — успамін пра маленства, школьныя гады, для трэціх — сустрэча з любімымі настаўнікамі, якія далі пуцёўку ў дарослае жыццё, а для кагосьці — успамін пра першае каханне, першы пацалунак Напярэдадні вечара сустрэчы мы ўзялі інтэрв'ю ў выпускніка школы 1992 года, зараз дырэктара нашай школы Чаплінскага Пятра Вікенцьевіча.

На пытанне:**хто быў дырэктарам школы і расказаць крыху пра свой клас, Пётр Вікенцьевіч адказаў:**

-Дырэктарам школы тады працавала Дзямідава Галіна Аляксееўна. Галіна Аляксееўна выкладала ў нас хімію. Па колькасці вучняў класы былі значна большыя, чым зараз. У нашым класе было 14 вучняў (6 дзяўчынак і 8 хлопчыкаў). Класным кіраўніком працавала Навіцкая Тэрэса Станіславаўна. Зараз сын Тэрэсы Станіславаўны працуе ў нас завучам па вучэбна-выхаваўчай рабоце Навіцкі Яўген Станіслававіч.

Школьнае жыццё ўспамінаецца да драбніц. Нават памятаю, што ў пачатковых класах я сядзеў за адной партай з Казакевіч Інай, а ў старэйшых з Віталіем Велямовічам і Аляксандрам Рыбалоўскім. У класе я сябраваў з Адамовічам Юрыям, Велямовічам Віталіем, Рыбалоўскім Аляксандрам.

Аднак зараз з аднакласнікамі сустракаемся рэдка, хоць жывём зусім побач.

**На пытанне: а ці было ў вас першае школьнае каханне?**

-Пётр Вікенцьевіч ўсміхаецца :- Няхай гэта застанецца сакрэтам.

**-Ці здейсніліся вашы мары і чаму Вы выбралі такую прафесію, як настаўнік?**

-Здейсніліся, таму што ёсць любімая сям'я, жонка, дзеці, якія падрастаюць і радуюць, ёсць прафесія, праца хоць цяжкая, але цікавая. А прафесію не я выбраў , а праффесія выбрала мяне. Часта ўспамінаю школу, школьных сяброў, настаўнікаў, працуючы у школе, нельга гэта не рабіць

**Віка Багуслаўская,**
**вучаніца 9 класа**



***З часоў далёкіх, самых даўніх,***
***Які б яму не выпаў лёс,***
***Да вучняў ідучы, настаўнік***
***З сабой у сэрдцы сонца нёс.***

***М. Чарняўскі***



***Вечар сустрэчы***

Родная школа на ўскрайку вёскі…
Прайшлі тут дзяцінства і сталасць мая.
Мілыя сэрцу ў скверы бярозкі,
Бачу вас кожную раніцу я.

Светлы, прасторны, прыгожы будынак,
Дзверы адкрыты наўсцяж.
Лепшых гадоў маіх тут прыпамінак –
З радасцю іду я ў клас.

Плён сваёй працы я бачу ў дзецях –
У дапытлівых,ясных вачах.
Колькі вас, вучняў былых маіх у свеце?
Сустрэчы бываюць нячаста ў нас.

Вечар сустрэчы – традыцыя школы.
Хай яны будуць часцей і цяплей,
Каб у жыцці нашым – цяжкім, суровым,
Стала на сэрцы крыху весялей.

Няхай адагрэюцца нашыя душы,
Хай дабрыян ў іх пануе адна.
Крыўда і зайздрасць няхай іх не сушыць –
Шчырасць, спагада адорыць спаўна.

Усіх я віншую з сённяшнім святам:
Святам сустрэчы школьных сяброў.
Хай шчасце паселіцца ва ўсіх вашых хатах,
І каб час для сустрэчы з вас кожны знайшоў.

***Я.Чаплінская***

************

В огнях мерцая, тает вечер,
От светлых чувств, душевных слов.
Сегодня в школе – радость встречи,
Моих друзей – выпускников.
Улыбки, смех, рукопожатия,
От счастья – сладкая слеза,
И вновь, сердечные признания,
Воспоминания…, луна.
Как мало нам для счастья надо,
Всего один радушный взгляд,
И сердце снова покоряет
Любви пленительный наряд.
Пусть не оставит равнодушных
Мир счастья, радости, цветов,
Чтоб был волнующим и нужным
Для всех нас – день выпускников.